**“Radziviliana” (2006–2015 гг.)**

Комплексны міжнародны праект, накіраваны на выяўленне кніжнай спадчыны Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў у сховішчах краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, правядзенне бібліяграфічнай рэканструкцыі кнігазбораў, стварэнне зводнай базы даных, электроннай бібліятэкі паўнатэкставых копій найбольш каштоўных дакументаў і выданняў, выданне друкаванага каталога і гісторыі ардынацкага збору. Частка калекцыі Нясвіжскай ардынацыі (звыш 500 выданняў) знаходзіцца ў фондзе навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. У 2009 г. па матэрыялах калекцыі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі падрыхтаваны электронныя выданні “Radziviliana: дакументальныя помнікі з фондаў НББ: творы прадстаўнікоў роду Радзівілаў” і “Radziviliana: дакументальныя помнікі з фондаў НББ: іканаграфія Радзівілаў”.